№№196–197
(2507–2508)

8 снежня 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнэце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

БЛИЦ

Недавно Европейский Союз принял "Послание к белорусскому народу", в котором предлагает белорусской власти выполнить 12 условий. Освободить всех политзаключенных, обеспечить проведение честных и справедливых выборов, расследовать громкие исчезновения, обеспечить свободу слова, уважать права профсоюзов и не препятствовать людям вступать в независимые профсоюзы, отменить смертную казнь и т.д.

Отсюда вопрос:

Сядет ли белорусская власть за стол переговоров с Европой, и будет ли она выполнять все 12 условий, выставленных Евросоюзом?

Николай КАНАХ, заместитель председателя Белорусского Конгресса демократических профсоюзов:

— Заместитель главы президентской Администрации Наталья Петкевич, кажется, уже однозначно заявила: Минск не согласится на выполнение требований Европейского Союза. Касаясь выполнения условий Международной организации труда, Петкевич заявила: мол, нам навязывают выполнение определенных условий, и тут же вводят в отношении страны экономические санкции.

Чтобы садиться за стол переговоров, Минску надо отменить многие предыдущие решения. Есть, например, рекомендации МОТ, включающие 14 пунктов. Следует отменить декрет №2, который ставит под угрозу само существование независимого профсоюзного движения; надо восстанавливать на работе уволенных, восстановить членство БКДП в Национальном совете по трудовым и социальным вопросам. Признавать свои ошибки тяжело, отменить уже принятые решения — еще труднее. В газете "Рэспубліка" опубликованы рекомендации МОТ. Да что толку? "Рэспубліка" опубликовала, а директора заводов, как и прежде, увольняют несогласных. Очень трудная ситуация на гродненском заводе "Азот": членов независимого профсоюза начальство вызывает на ковер и под угрозой расторжения трудового контракта заставляет выходить из профсоюза. Вот и все рекомендации. С другой стороны, власть вынуждена будет пойти на выполнение условий Евросоюза. Но лично я не жду никаких радикальных перемен: будут выполняться наиболее приемлемые для властей условия, либо условия ЕС будут выполняться частично.

Регина КУЛЯКОВИЧ, повар:

— Мне кажется, власть не отпустит на волю того же Козулина. Выпустить его на свободу — значит, признать свое поражение. Думаю, белорусские власти будут всячески увиливать от выполнения этих условий.

Александр ВОЙТОВИЧ, академик:

— Если Европейский Союз будет последовательно отстаивать все 12 пунктов, изложенных в "Послании к белорускому народу", то в этом случае власть точно не сядет за стол переговоров. Если же властям удастся вычленить наиболее приемлемые для себя пункты и навязать их Европейскому Союзу — в этом случае можно ожидать, что власть согласится вести переговоры с европейцами. Что касается выполнения 12 требований Евросоюза, то здесь работает очень простая логика. Если власть будет выполнять требования, то скоро Лукашенко окажется не у власти. А потому вывод очень простой: Лукашенко никогда не пойдет на выполнение требований ЕС.

Светлана УВАЛОВА, доярка:

— Я об этом даже не думаю. У меня одна проблема — как на мою зарплату прокормить двоих детей.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Некалькі гадоў таму "Народная воля" пісала пра барацьбу сям'і Лапіцкіх з Жодзіна за права навучаць дзяцей на беларускай мове. Цікава было б ведаць, чым усё скончылася?

Наталля КРЫВЕЦ, маці дваіх дзяцей. г.Мінск.

Ёсць у Жодзіне тэрыторыя Свабоды, на якой сям'я Лапіцкіх прымусіла чынавенства паважаць Канстытуцыю

Наш карэспандэнт сазваніўся з Лапіцкімі. Паводле слоў спадара Аляксея, гаварыць пра заканчэнне барацьбы ягонай сям'і за свае канстытуцыйныя правы пакуль рана. Улада не дае Лапіцкім расслабіцца. Янка Лапіцкі зараз вучыцца ў 5 "А" класе 1-й жодзінскай гімназіі. Спачатку хлопчыка залічылі ў клас "Б", але бацькам Янкі не спадабалася тое, што класны кіраўнік там рускамоўны. Дырэктар гімназіі, даведаўшыся пра іхнюю незадаволенасць, адразу прапанаваў перавесці Янку ў клас "А", у якім дзеці вучацца па "спецыяльнай беларускамоўнай праграме" (гэта значыць, беларуская мова не даміную, але ўсё ж прысутнічае).

У гімназіі цяперашні Янкаў клас называюць "міні-беларускім". А сам хлопчык у гімназіі — асоба ў пэўным сэнсе прывілеяваная. З іншымі вучнямі класа ён бывае хіба што на фізкультуры ды танцах. Што ж датычыць іншых прадметаў, дык іх Янка вывучае індывідуальна. Для гэтага ён мае ў гімназіі спецыяльнае памяшканне і спецыяльных выкладчыкаў, кандыдатуры якіх ухвалілі ягоныя бацькі. Хтосьці, магчыма, скажа, што гэта "рэзервацыя". Але насамрэч — гэта адваяваная тэрыторыя. Тэрыторыя Свабоды, на якой грамадзяне прымусілі чынавенства паважаць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ДЫПКУР'ЕР

Стэфан Шмялеўскі вяртаецца на радзіму

На пачатку будучага года ў Беларусь прыедзе новы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Францыі.

Час ляціць хутка. Здавалася б, толькі нядаўна Шмялеўскі прыступіў да выканання сваіх абавязкаў і вось — ужо развітваецца. Чатыры гады прамільгнулі як адзін дзень...

Ужо вядома, што Стэфан Шмялеўскі будзе працаваць у Міністэрстве замежных спраў Францыі на пасадзе дарадцы па пытаннях рэлігій.

Марына КОКТЫШ.

Анатоль Лябедзька прапануе пачаць працэдуру імпічменту Аляксандру Лукашэнку

Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заявіў, што зараз рыхтуе зварот да кожнага дэпутата Палаты прадстаўнікоў з прапановай пачаць працэдуру імпічменту прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку.

Партыя ў межах кампаніі "За свабоду!" ініцыіруе арганізацыю і ажыццяўленне шэрагу акцый і дзеянняў, мэтай якіх з'яўляецца правядзенне ў Беларусі свабодных выбараў без фальсіфікацый. Акрамя прапановы аб імпічменце, АГП лічыць неабходным дабівацца адстаўкі ўсяго складу Цэнтрвыбаркама, які адказваў за правядзенне прэзідэнцкай кампаніі. Лябедзька пераканаены, што пасля прызнанняў Лукашэнкі ў фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкай кампаніі ў членаў Цэнтрвыбаркама няма падстаў займацца арганізацыяй выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы.

Ініцыятыва Людмілы Пастаялка

Замежнікам, якія прыбываюць у Беларусь на тэрмін больш за месяц, выдаваць уязныя візы трэба толькі пры наяўнасці даведкі аб адсутнасці ВІЧ-інфекцыі. З такой ініцыятывай выступіла старшыня пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльным развіцці Людміла Пастаялка.

Дарэчы, на сённяшні дзень такая норма існуе толькі "на ўзроўні падзаконнага акта".

Слуцк застаецца без «новага» Жукава

Слуцкія ўлады адмовіліся ад усталявання помніка маршалу Георгію Жукаву, прызначанага да дня народзінаў палкаводца — 1 снежня. Яны не рызыкнулі ставіць бронзавы бюст на нядбайны бетонны п'едэстал.

Пастамент быў выраблены спехам і пагражаў папросту развалiцца пад вагой 100-кілаграмовага помніка.

Нагадаем, што Жукаў жыў у Слуцку тры гады ў 1930-х, калі камандаваў кавалерыйскай дывізіяй. Стары помнік на новы меліся замяніць яшчэ ў мінулым годзе, калі Слуцк рыхтаваўся да "Дажынак". Аднак тады на ажыццяўленне задумы не хапіла грошай. Дарэчы, выраб маршальскага бюста каштаваў амаль 60 мільёнаў рублёў.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Святлана СТАЦЭНКА:

«Каб перамагчы, нам не хапіла другога Андрэя Кунца»

Другі год запар Беларусь больш чым паспяхова выступае на дзіцячым "Еўрабачанні". Год таму Еўропу пакарыла чароўная Ксюша Сітнік, заваяваўшы першае месца прэстыжнага конкурсу. Сёлета 10-гадовы Андрэй Кунец заняў другое месца, саступіўшы толькі сёстрам-блізнятам Талмачовым з Расіі.

І Ксенію, і Андрэя да ўдзелу ў конкурсе рыхтавала Святлана Стацэнка. Ей, аўтару перамог юных беларусаў, мы і патэлефанавалі.

"Лічу, што Андрэй выступіў нармальна, у сваю моц, — вось так сціпла ацаніла другое месца юнага спевака Святлана Адамаўна. — *Гэтыя ж словы я сказала яму адразу пасля выступлення. Андрэй засмуціўся: "Святлана Адамаўна, я хацеў зрабіць вам прыемнае, хацеў перамагчы..." Я яго супакоіла, бо на сцэне ён глядзеўся нармальна.*

— А чаго, на Ваш погляд, не хапіла для першага месца?

— Яшчэ да ад'езду на конкурс я гаварыла журналістам, што Расія вельмі моцна падрыхтавалася. Іх двое, яны абаяльныя блізняткі — гэта ўжо падкупляе. Таму для таго, каб заняць першае месца, нам не хапала на сцэне другога Андрэя Кунца. Хаця па шчырасці скажу, што песня "Новы дзень", на мой погляд, больш адпавядала еўрапейскаму стандарту, чым "Вясновы блюз", з якім перамаглі расіянкі.

— Святлана Адамаўна, у свой час шмат крытычных стрэл ляцела ў адрас Ксеніі Сітнік за тое, што, прадстаўляючы Беларусь, яна спявала на мове суседняй дзяржавы. Андрэй Кунец таксама спяваў па-руску. Чаму?

— Я не схільная драматызаваць сітуацыю. Але для не зусім інфармаваных заўважу, што ў Беларусі дзве дзяржаўныя мовы. Па правілах "Еўрабачання" песня павінна быць на адной з дзяржаўных моў. Андрэй любіць беларускую мову, аднак вырас у рускамоўным асяродку. Таму па-руску яму было спяваць прасцей. Выступаць з песняй на мове, якой не карыстаешся, — толькі дадаваць лішніх нерваванняў. А тут і так адказнасць вялікая.

— Ці праўда, што за другое месца на "Еўрабачанні" Андрэй атрымаў салідны грашовы прыз?

— Ніякіх грошай ён не атрымаў, роўна як і нейкіх матэрыяльных каштоўнасцяў. Толькі грамадскае прызнанне. Калі вы асабіста хочаце нешта падарыць Андрэю — калі ласка...

Дарэчы, 7 снежня ў Андрэя дзень народзінаў, я рыхтую яму падарунак. Хутчэй за ўсё, гэта будзе новая песня, з якой мы паспрабуем пакарыць Віцебск, бо ў будучым годзе мы будзем спрабаваць выступіць на "Славянскім базары".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ДА ВЕДАМА

Аб тым, што менавіта Андрэй Кунец паедзе на "Еўрабачанне", стала вядома 30 верасня, калі ў эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала прайшоў фінал рэспубліканскага конкурса "Еўрабачанне-2006". У фінале адбор ішоў з 10 выканаўцаў, хаця першапачаткова ў конкурсе ўдзельнічалі 42 заяўкі.

Андрэй Кунец — саліст Нацыянальнага цэнтра мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна.

Пасля перамогі на рэспубліканскім конкурсе Андрэй Кунец пераехаў з Мазыра ў Мінск. Юны спявак пасяліўся ў інтэрнаце, якое прадаставіла Міністэрства культуры. Праўда, толькі на тыдзень. Пасля ён вярнуўся ў Мазыр і два разы на тыдзень пераадольваў 300 кіламетраў да Мінска, каб удзельнічаць у рэпетыцыях.

Анкета Андрэя КУНЦА:

Дата нараджэння — 7 снежня *1995 года.*

Месца нараджэння — Мазыр.

Самае любімае месца ў горадзе? — Гарадскі парк.

Якія рысы характару табе ўласцівыя? — Найстолівасць, дабрыня, весялосць.

Ад якіх рысаў характару хацеў бы пазбавіцца? — Лянота, упартасць.

Любімыя прадметы ў школе? — Руская літаратура.

Любімы фільм? — "Мая цудоўная няня".

Кім хочаш стаць, калі вырасцеш? — Спевакам.

Чым займаешся ў вольны час? — Спяваю, малюю.

З кім са знакамітасцяў ты хацеў бы праспяваць дуэтам? — З Палінай Смолавай.

Любімы колер? — Белы, асацыруецца з дабрынёй, і жоўты, асацыруецца з сонцам.

Любімая страва? — Курыца па-мазырскі, якую гатуе мама.

АТАМНЫ ПРАЕКТ

Пад беларускую АЭС абрана пляцоўка ў Чавускім раёне

Прынцыповае рашэнне аб будаўніцтве ў Беларусі атамнай электрастанцыі прынята.
Такі вынік нарады з удзелам Аляксандра Лукашэнкі па пытаннях энергетычнай бяспекі Беларусі.

Галоўнае — "правільная інфармацыя"

Як мы раней паведамлялі, пасля візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Маскву і ягоных перамоў з Уладзімірам Пуціным, беларускі ўрад аператыўна скарэкціраваў свае планы па так званым "атамным праекце". Раней падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва станцыі планаваліся пачаць у 2008 годзе, зараз — у 2007-м. Раней планавалася, што беларуская АЭС запрацуе ў 2015 годзе, але зараз Аляксандр Лукашэнка загадаў скараціць тэрміны будаўніцтва на два гады. Яшчэ нядаўна гаварылася пра тое, што будзе праведзены рэферэндум і менавіта беларускі народ выскажацца аб тым, ці патрэбна краіне АЭС. Зараз нічога абмяркоўваць з народам ужо не плануецца. Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы нараду, заявіў: *"Я ўпэўнены, што пры правільным інфармаванні народа Беларусі аб сітуацыі ў энергетычнай сферы і перспектывах развіцця рэспублікі людзі пагодзяцца з пазіцыяй кіраўніцтва краіны і падтрымаюць яе".*

Наглядальнікі, дарэчы, даўно звярнулі ўвагу, што на "энергетычных нарадах" усё часцей сталі выступаць прадстаўнікі Чавускага райвыканкама — раёна, дзе частка земляў радыяцыйна забруджана. Няўжо АЭС вырашылі будаваць тут, што можа яшчэ больш пагоршыць экалагічную сітуацыю ў рэгіёне?

Падобна на тое.

Апошняе слова скажа Савет бяспекі

Першыя магутнасці беларускай атамнай электрастанцыі могуць быць уведзены ў эксплуатацыю ў 2013 годзе. Па крайняй меры, пра гэта заявіў старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго даных, пакуль найбольш прыдатным месцам для будаўніцтва АЭС спецыялісты лічаць Чырвонапалянскую пляцоўку ў Чавускім раёне Магілёўскай вобласці. Другім магчымым адрасам для АЭС застаецца Шклоўскі раён. І, дарэчы, яшчэ нядаўна спецыялісты гаварылі, што па выніках геалагічных, экалагічных і іншых даследаванняў больш падыходзіць Шклоўшчына. Але па нейкіх прычынах па выніках нарады ў Аляксандра Лукашэнкі перавага была аддадзена Чавусам. *"Калі будзе выяўлена, што сейсма- і тэктанічныя паказчыкі выклікаюць сумненні, то будзе разглядацца іншая пляцоўка"*, — пракаментаваў гэты факт Міхаіл Мясніковіч.

Апрача таго, паводле слоў М.Мясніковіча, разглядаецца варыянт размяшчэння АЭС ля заходняй мяжы Беларусі. "Гэта пытанне таксама актуальна, — дадаў ён. — Ураду даручана ў самыя сцісłыя тэрміны ўнесці адпаведныя прапановы ў Савет бяспекі, які прыме канчатковае рашэнне". Дарэчы, і старшыня Савета бяспекі Віктар Шэйман, і дарадца кіраўніка дзяржавы па пытаннях бяспекі Віктар Лукашэнка прысутнічалі на нарадзе і старанна занатоўвалі ўсё тое, пра што гаварылі вучоныя. Як вядома, ні Шэйман, ні Лукашэнка-малодшы не з'яўляюцца спецыялістамі ні ў эканоміцы, ні ў энергетыцы. І вельмі дзіўна, што менавіта ім, а не вучоным даручана сказаць апошняе слова ў "атамным праекце".

Раённая ўлада вітае "атамны праект"

Першы намеснік кіраўніка чавускай "вертыкалі" Васіль Сысоеў пацвердзіў журналістам, што ў раёне на месцы, вызначаным пад магчымае будаўніцтва, ужо вядуцца актыўныя геалагічныя даследаванні. Апрача таго, у мінулую пятніцу на пасяджэнне ў Акадэмію навук быў выкліканы кіраўнік раёна, які ў звязку з будаўніцтвам АЭС агучыў варыянт рэанімацыі рэгіёна — дарэчы, Чавускі раён на Магілёўшчыне адзін з найбольш забруджаных ад радыеактыўных выкідаў падчас аварыі на ЧАЭС.

"Мы вельмі хочам, каб гэта станцыя была пабудавана тут. Наш старшыня выканкама таксама браў удзел у нарадзе, выступаў са сваімі прапановамі, з аналізам сітуацыі, якая склалася ў рэгіёне — эканамічнай, дэмаграфічнай. Канешне, раён у нас своеасаблівы, напалову накрыта радыяцыйны паўднёвая частка. І тое, што знаходзімся побач з Магілёвам, выклікала масавы адток насельніцтва. Натуральна, што мы хочам, каб людзі сюды вярнуліся. Месцы ў нас даволі нядрэнныя, месцы прыгожыя і трэба, каб тут жылі людзі", — гаворыць Васіль Сысоеў.

Алена НОВІКАВА.

У ТЭМУ

Атамную энергетыку дазваляюць сабе толькі багатыя краіны

Расійскі "Грынпіс" выступае супраць планаў будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН заявіў кіраўнік антыядзернай праграмы расійскага падраздзялення міжнароднай экалагічнай арганізацыі "Грынпіс" Уладзімір Чупроў.

"Грынпіс" выступае супраць такіх планаў, дарэчы, і не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. Мы лічым, што такія заявы і такое планаванне па крайняй меры неразумна, асабліва для Беларусі", — сказаў У.Чупроў.

На думку эксперта, атамную энергетыку дазваляюць сабе толькі багатыя краіны, якія могуць забяспечыць яе схаванае і прамое субсідзіраванне. *"Асабліва гэта тычыцца утылізацыі радыеактыўных адходаў"*, — зазначыў У.Чупроў і паведаміў, што расходы на утылізацыю чатырох старых рэактараў, якія выводзяцца з эксплуатацыі ў Расіі, ужо складаюць 6 млрд. расійскіх рублёў.

"Памылковай думкай, на якую заўсёды забываюцца лабісты ад атамнай энергетыкі, з'яўляецца і тое, што атам — гэта галоўная крыніца энергіі будучыні. На атамную энергетыку прыпадае ўсяго толькі 6% у агульным энергетычным балансе, і гэтая доля ў свеце будзе толькі падаць. Атамная энергетыка ніколі не будзе асноўнай крыніцай паводле вызначэння", — лічыць У.Чупроў.

Эксперт "Грынпіса" ўпэўнены, што атамная энергетыка не забяспечыць незалежнасць Беларусі ад пастаўшчыкоў вуглевадародnай сыравіны. *"Па-першае, атамная энергетыка не вырашае праблему нафты, гэта значыць, яна дае электраэнергію, але яна не дае транспартнае паліва, з гэтым увесь час сутыкаюцца ЗША і Францыя, якія таксама паставілі на атамную энергетыку на пачатку 1970-х гадоў, але ў выніку не пазбавіліся ад імпарту нафты і газу,* — сказаў У.Чупроў. *— Па-другое, хутчэй за ўсё АЭС будзе будаваць Расія, а значыць, і Расія будзе пастаўшчыком паліва. Запасы ўрану для вытворчасці паліва па тэрмінах вычарпання параўнальныя з запасамі нафты. Гэта азначае, што праз 10—15 гадоў свет, і Расія ў тым ліку, сутыкнецца з праблемай дэфіцыту таннага ўрану". Паводле звестак эксперта, кошт прыроднага ўрану за апошнія два-тры гады на сусветным рынку вырас утрая. Сёння Расія закрывае свае патрэбы за кошт здабывання новага ўрану на 20%, "усё астатняе — гэта яшчэ савецкія запасы"*, — зазначыў Чупроў. *"У сувязі з гэтым складана казаць, што Расія будзе гарантаваць 100-працэнтныя пастаўкі. Гэта значыць, ніякай незалежнасці не будзе — на тэрыторыі Беларусі няма ўранавых радовішчаў, і гэта трэба сабе вельмі выразна ўяўляць"*, — падкрэсліў прадстаўнік "Грынпіса".

На яго думку, Беларусі варта больш уважліва разглядзець альтэрнатыўныя сцэнарыі, задзейнічаць іншыя, больш танныя крыніцы энергіі, як, напрыклад, утылізацыя біямасы ў лясной і сельскай гаспадарцы і г. д.

Апрача таго, паводле слоў У.Чупрова, *"Беларусь, як і іншыя краіны СНД, — гэта пераемніца савецкіх энергамагнатраўных традыцый, адсюль значныя дзіркі ў ЖКГ, у іншых галінах, а іх можна ўжо цяпер закрываць і гэтым здымаць вастрыню дэфіцыту таго ж газу". "Прычым гэтыя энергазберагальныя мерапрыемствы значна таннейшыя і хутчэйшыя ў выкананні, чым будаўніцтва АЭС"*, — зазначыў суразмоўца БелаПАН.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 СНЕЖНЯ 2006 г.

КАК ЭТО БЫЛО

Случайные кадры

Кадры, снятые 15 лет назад в никому не известном охотничьем домике "Вискули" в Беловежской пуще съемочной группой Белорусского телевидения, стали единственным живым свидетельством распада крупнейшей в мире империи — Советского Союза. Пленка о "беловежских зубрах" — документ случайный, журналисты белорусского телевидения оказались на месте событий совершенно неожиданно.

Воспоминаниями о том, что происходило 8 декабря 1991 года в Вискулях, с читателями "Народной воли" делится ***Вадим БИЦАН****, который в то время работал специальным корреспондентом Государственного комитета по телевидению и радиовещанию БССР.*

— В тот день в Минске встречали российскую делегацию во главе с Борисом Ельциным. Должно было состояться подписание Договора о дружбе и сотрудничестве между РСФСР и БССР. Но тут краем уха мы услышали слово "Вискули" (в то время мало кто знал про эту охотничью дачу в Беловежской пуще): мол, три президента собираются в Вискули...

Вискули, Вискули... Как старому репортеру (я с 1966 года работал на телевидении) мне стало интересно: а что это такое? Но напрямую спросить у присутствующих — вроде как неудобно. Рядом находился Кебич, премьер-министр, к которому я обратился напрямую: "Вячеслав Францевич, вы собираетесь в Вискули, как же без нас?" "А я вас возьму", — был ответ.

И все-таки управляющий делами Совета министров заявил, что нас взять в самолет с официальными лицами не смогут. Хорошо, председатель Комитета по авиации Федоров, с которым я поддерживал дружеские отношения, согласился взять нас в свой самолет. Сказал: "В 12.30 вылетаем — будьте готовы".

Подписание договора между РСФСР и БССР проходило около 11.00 или 11.30 в Войсковом переулке. Я сразу же понес отснятый материал в телецентр на улице Коммунистической, где мы тогда работали, сделал репортаж, прихватил с собой три видеокассеты (одна потом оказалась испорченной). И мы полетели в Вискули.

На место прибыли около 12 часов дня. Спустя некоторое время приземлился и самолет Кравчука, которому поднесли хлеб-соль. А потом до 6 часов вечера ждали Ельцина. Оказывается, после подписания договора в Минске состоялся банкет, поэтому Борис Николаевич и задержался.

А мороз крепчал, было больше 25 градусов мороза. Стало темнеть. Мы попросили военных, когда прилетит Ельцин, направить свет на самолет. Так они и сделали. Прилетел Ельцин, как мне показалось, в довольно "теплом" состоянии, спустился по трапу, принял свою порцию хлеба-соли... И руководители трех республик укатили из военного аэродрома в Вискули.

А как быть нам, журналистам? С таким вопросом я обратился к помощнику Кебича. "А нам о вас никто ничего не говорил", — сообщил тот.

Как же так: личный фотограф Ельцина Дима Соколов, который по совместительству работал на РИА "Новости", поехал, а мы, белорусы, остались с носом? В конце концов, на уазике отвезли в Вискули и нас, журналистов: Валеру Дроздова из "Народной газеты" (к сожалению, не дожил до сегодняшних дней), директора БелТА Якова Алексейчика, российского фотографа Юрия Иванова, меня и нашего оператора Владимира Андронова.

Вообще, от подготовки этого мероприятия все были в шоке: людей собралось очень много, а разместить всех негде. Тогда вспомнили, что в Каменце есть охотничий домик — это от Вискулей километров восемь или десять. Нас отправили туда. Красивый, хороший домик, только не протопленный. Утром проснулись под белыми от инея одеялами. Попытались завести добитую "Волгу" — безуспешно. Тогда мы все двинули на почту, нашли телефон Вискулей и потребовали доставить нас на место. Через некоторое время за нами приехала машина...

В тот день я впервые попал в Вискули. Внутри здания резиденции — большой белый зал с балконами. Мы жались к стенке, пока о нас вдруг не вспомнили, — надо же было, чтобы кто-то рассказал о том, что решено создавать Содружество. А когда вспомнили, то предложили бутерброды, даже по 20 граммов налили.

Когда основной документ был подготовлен, из Каменюков, из местного музея, привезли женщину, чтобы она его напечатала. А в самой резиденции откуда-то из-под крыши достали большой белый стол, на нем поставили флажки трех республик... Наконец выходят главные действующие лица: Шушкевич, Кравчук, Ельцин, Фокин — премьер Украины, Кебич, Бурбулис. Сели. Подписали документы. После этого от имени президентов взял слово Шушкевич...

Ельцина нам снимать не дали. Коржаков даже пригрозил: мол, кроме вас, ребята, здесь никого с камерой нет; если "просочится" хоть один кадр, компрометирующий Бориса Николаевича, будете иметь дело со мной.

В соседнем зале работали дипломаты, которые тут же, на наших глазах, вырабатывали документы в развитие соглашения. И тут же, просто как на конвейере, подписывали...

Все охотно давали интервью. Возможно, Станислав Шушкевич и обидится, будет опровергать мои слова, но не были они абсолютно трезвыми. Не стану утверждать, что они были и пьяными, но и трезвыми их не назовешь...

— Получается, развал СССР и создание СНГ происходило прямо на ваших глазах.

— Да. После подписания соглашения Ельцин связался с Бушем, предупредил, чтобы не волновался. И только потом позвонили Горбачеву, поставили в известность его. Наконец, в самую последнюю очередь вспомнили, что забыли про Назарбаева. А Казахстан в то время был четвертой в Союзе республикой — и по территории, и по количеству русского населения. Позвонили Назарбаеву — застали его в аэропорту. Выслушав сообщение, он сказал: "Заправляюсь и вылетаю". Но все-таки Назарбаева перехватил Горбачев, что-то пообещал ему, разъяснил ситуацию. Обидевшись на своих коллег, Назарбаев улетел в Алма-Ату, где в срочном порядке организовал собственный союз среднеазиатских республик. Просуществовал он, как известно, недолго. А затем все азиатские республики приняли в СНГ — все сразу.

Кстати, в Вискулях связь с внешним миром полностью находилась у охраны Ельцина. Пожалуй, только где-то к 20.00 разрешили Алексейчику передать краткую информацию о событиях в Беловежской пуще.

Затем нас посадили в ЯК-40 и отправили в Минск. Около 11 вечера мы были в Минске, и в течение часа я подготовил 20-минутный репортаж об образовании Содружества. Он вышел в эфир в полночь.

— У вас не сложилось впечатление, что у руководителей республики не было определенного сценария развала Союза, что события развивались, что называется, по ходу действа?

— За год до Вискулей в Москве проходил 4-й съезд депутатов. Нашу съемочную группу направили в Белый дом на подписание договора о дружбе между РСФСР и БССР: подписывали Дементей и Ельцин — как председатели президиумов Верховных Советов. Тогда белорусский премьер Кебич толкнул меня в бок и сказал примерно следующее: "Через год мы такой Брестский мир подпишем..." В общем, я уверен, что задолго до Вискулей говорили об этом, знали, готовились.

— Почему же Шушкевич, Кравчук, Ельцин избрали для такого судьбоносного решения именно Беловежскую пущу? Есть ли в этом определенный смысл?

— "Беловежские зубры", как мне кажется, не исключали возможности ответных действий. Даже в Беловежской пуще они ждали десанта. В 1994-м, например, Кебич, выступая перед десантниками, признавался: ребята, хватило бы одной роты, чтобы разом покончить со всеми заговорщиками. Только Горбачев не решился.

Вообще-то, Беловежская пуща, по замыслу организаторов, должна была служить прикрытием: поедем, мол, поохотимся. Кравчук сразу в штыки воспринял эту идею: мол, никогда на охоте не был, никогда из ружья не стрелял... Но ему намекнули, что, помимо охоты, их ждет важное дело.

— Вы были единственными телевизионщиками, снявшими уникальные кадры подписания Беловежских соглашений. Сегодня телевизионщики озолотились бы...

— ...а в то время на телевидении были проблемы с кассетами. Мы записывали их, затем переписывали новые события. Никто не думал, что это история. Мы сделали репортаж на 20 минут, утром я перегнал сюжет в Украину. И видеокассеты сдал в архив. Вот и все. Не помню даже, получил ли гонорар за тот репортаж...

Записал Юрась ДУБИНА.

АСЦЯРОЖНА — ФАШЫЗМ!

Гаўкнулі — і зноў схаваліся...

Ганьбай для Упраўлення КДБ па Віцебскай вобласці стала бяссілле ягоных супрацоўнікаў супраць нахабных вылазак у абласным цэнтры падпольнай групоўкі рускіх фашыстаў, што дзейнічаюць ад імя незарэгістраванай арганізацыі РНЕ — "Русское национальное единство".

Яны ўжо не раз дасылалі абразлівыя, пагражальныя лісты на адрасы асобных грамадзян і ўстаноў. Сёлета лісты з пагрозамі (наша газета пісала пра гэта) атрымлівалі актывісты АГП Алена Залоская і рэдакцыя газеты "Витебский курьер". Сэнс лістоў — патрабаванне адмовіцца ад якіх-небудзь дзеянняў, якія шкодзяць цяперашнім беларускім уладам "аб'ядноўваць нашу краіну з Расіяй", "змагацца супраць апазіцыі, яўрэяў і ЗША". У заключнай частцы ліста, як правіла, дужа малапісьменнага, выказвалася прапанова ўступаць у РНЕ і пагроза: калі адрасат не зменіць сваю пазіцыю, то да яго будуць прыняты "самыя рашучыя захады аж да фізічнага ўздзеяння".

Зварот А.Залескай у праваахоўныя органы застаўся, па сутнасці, без рэагавання. З КДБ ёй адказалі, што ніякага РНЕ ў Віцебску няма.

Але вось зусім нядаўна, 28 лістапада, фашысты-падпольшчыкі зноў выявіліся. Ліст, падобны на папярэднія, атрымала загадчыца літаратурнай часткі беларускага тэатра "Лялька" Вікторыя Дашкевіч. Звяртаючыся да яе, аўтары, адрэкамендаваўшыся прадстаўнікамі ўсё той жа арганізацыі РНЕ, патрабуюць, каб лялечны тэатр у Віцебску неадкладна і рашуча адмовіўся ад выкарыстання беларускай мовы, бо "ў бліжэйшыя гады Беларусь увойдзе ў склад Расіі". Тэатру прапануецца перакласці тэксты спектакляў на рускую мову і нават прапануецца фінансаванне гэтай працы.

На другім баку ліста адлюстравана свастыка, характэрная для ўлётак РНЕ, указаны нумар маскоўскага тэлефона і электронны адрас офіса РНЕ.

Вікторыя Дашкевіч назвала атрыманы ліст дробным хуліганствам і дадала, што яе моцна ўразіла жудасная непісьменнасць тых, хто складаў "ультыматум". Няправільна напісана нават прозвішча адрасата (Дошкевіч замест Дашкевіч).

В.Дашкевіч заявіла, што будзе звяртацца ў праваахоўныя органы, з тым каб яны знайшлі і пакаралі аўтараў абразлівага ліста.

Цікава, які адказ атрымае заяўніца ў КДБ, дзе, відаць, жывуць усё яшчэ па сталінскай формуле: "Няма чалавека — няма праблемы"? Лягчэй, вядома, аб'явіць, што фашыстаў у Віцебску няма, чым усур'ёз займацца іх пошукам.

P.S. *Дарэчы, ліст, падобны да таго, што атрымала Вікторыя Дашкевіч у тэатры "Лялька", за некалькі дзён да таго быў атрыманы і Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Я.Коласа.*

Тэндэнцыя, аднак!

Сяргей БУТКЕВІЧ.

АКЦЫЯ

Разам — выратуем!

Мастакі і дзеячы культуры Мінска пры падтрымцы Беларускага саюза мастакоў, Беларускага саюза дызайнераў і Мінгарвыканкама правядуць дабрачынную выставу-аўкцыён. Мэта акцыі — дапамога дзецям, якім патрэбна хуткая аперацыя па трансплантацыі нырак. Сваёй чаргі на гэтую аперацыю, кошт якой каля ста тысяч долараў ЗША, зараз чакаюць 20 дзяцей.

Аўкцыён праходзіць у рамках больш маштабнай акцыі па зборы неабходных сродкаў "Дзяцінства — дзецям". Ён адбудзецца з 15.00 да 17.00 16 снежня ў памяшканні Планетарыя ў Парку імя М.Горкага. У аўкцыёне возьмуць удзел вядомыя акцёры, спевакі і музыканты.

Ул.інф.

НУ І НУ!

Беларусь непакоіць правы чалавека ў ЗША

Трэці камітэт Генеральнай асамблеі ААН адхіліў праект рэзалюцыі, прапанаванай Беларуссю аб становішчы з правамі чалавека ў ЗША. За яе прагаласавалі ўсяго шэсць дзяржаў, 114 выступілі супраць і 45 краін устрымаліся.

У непрынятай рэзалюцыі ўтрымлівалася асуджэнне ЗША за *"сістэматычныя парушэнні асноўных правоў чалавека і свабод у гэтай краіне, у тым ліку за замахі на свабоду друку і жорсткі кантроль над сродкамі масавай інфармацыі"*. У беларускім праекце гаварылася пра самавольныя і тайныя затрыманні і арышты, шырокамаштабныя выпадкі праяў нецярпімасці, ксенафобіі і дыскрымінацыі. У праекце ўзгадвалася, што выбарчая сістэма ЗША не адпавядае міжнародным патрабаванням і вядзе да таго, што многія грамадзяне гэтай краіны пазбаўлены права браць удзел у галасаванні. Беларусь прапанавала асудзіць ЗША за прымяненне смяротнага пакарання ў дачыненні да непаўналетніх і псіхічна хворых асоб.

Выступаючы перад галасаваннем, прадстаўнік ЗША зазначыў, што некаторыя праблемы, узнятыя ў беларускім праекце, добра вядомы дэлегатам, паколькі пра іх шмат і падрабязна пісаў амерыканскі друк. На яго думку, гэта з'яўляецца сведчаннем *"глыбокага дэмакратызму амерыканскага грамадства, дзе свабодныя СМІ, незалежны суд і грамадзянская супольнасць уважліва сочаць за выкананнем правоў чалавека"*. А вось пра што пішуць беларускія СМІ? Ці ёсць у Беларусі незалежны суд? Чаму ўлады перашкаджаюць фарміраванню грамадзянскай супольнасці?

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Куды знік вядучы АНТ Юрый Шынкар?

Памятаеце, адзін час ішла аўтарская перадача Юрыя Шынкара? Ён, як мне здавалася, аж са скуры вылузваўся, адстойваючы пазіцыі сённяшняй улады. І раптам — знік. Дзе ён цяпер? Што здарылася? Не дагадзіў гаспадарам?

Сцяпан СВЯРЖЫЦКІ,
Магілёўская вобласць.

Сапраўды, 2 верасня 2003 года ў эфіры беларускага тэлеканала АНТ з'явілася новая перадача "Особое мнение". Тэлекампаніяй яна анансавалася як пяціхвілінны каментар вядучага па актуальных пытаннях і выходзіла штодня пасля вячэрняга выпуску навін. Дастаткова ўзгадаць толькі некалькі тэм — "Выбор за вами", "Союз будет развиваться", каб зразумець танальнасць гэтай перадачы.

Першым вядучым "Особого мнения" стаў выкладчык філасофіі Юрый Шынкар. Што, дарэчы, для былых выпускнікоў БДУ, якія памяталі даволі дэмакратычныя лекцыі Шынкара па гістарычным матэрыялізме, стала поўнаю нечаканасцю. Але, мяркуючы па тым, што дэкламаваў Шынкар, неадрыўна гледзячы ў аб'ектыў тэлекамеры, з цягам часу змяніўся не толькі яго знешні выгляд, але і погляды.

Праз некаторы час Юрый Шынкар знік з эфіру, а ў лютым гэтага года выйшаў і апошні выпуск "актуальнага каментара".

"Кожная праграма жыве і памірае па сваіх законах, — кажа выпускаючы рэдактар канала АНТ Леанід Дубаневіч. — *Перадача "Особое мнение" выходзіла ў эфір пэўны тэрмін, яна была разлічана на канкрэтны перыяд часу. Краіна рыхтавалася да выбараў. Цяпер на АНТ з'явілася новая перадача "Большая политика", якая выходзіць у эфір кожную суботу. Неабходнасць у "Особом мнении" адпала.*

Шынкар быў задзейнічаны толькі на перадачу "Особое мнение", меў адмысловы кантракт. Але сышоў ён па прычыне хваробы".

Як нам стала вядома, зараз Юрый Шынкар нідзе не працуе. Не так даўно ён стаў пенсіянерам, і, як кажуць яго родныя, *"адпачывае, займаецца дамашнімі справамі"*.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

РЭВІЗІЯ

Вось дык пагаспадарылі!

Падчас праверкі Камітэтам дзяржкантролю Брэсцкай вобласці працы жывёлагадоўчых аб'ектаў у зімовых умовах сур'ёзныя недахопы выяўлены ў ААТ "Маеўскае" Пружанскага раёна. Пра гэта паведаміў БелаПАН кіраўнік інфармацыйна-аналітычнай групы Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Віталь Колас.

Паводле яго слоў, устаноўлены недастачы, прыпіскі ў статсправаздачнасці, незаконная выплата заработнай платы, гібель жывёлы па віне службовых асоб і псаванне сельскагаспадарчай прадукцыі. Так, было завышана пагалоўе кароў і скажоныя звесткі статсправаздачнасці. За 10 месяцаў гэтага года ў гаспадарцы загінулі 56 галоў буйной рагатай жывёлы, 8 коней і 28 свіней. Урон ад падзяжу і гібелі, які склаў 19,6 млн рублёў, у саломай было заарана каля 800 тон мякіны. Пры адсутнасці ў гаспадаркі племяннай жывёлы ўведзена пасада тэхніка па племяннай справе, якому з 14 лістапада 2005 года па 31 сакавіка 2006 года неабгрунтавана выплачана 500,2 тыс. рублёў заработнай платы. Матэрыялы праверкі, як абяцае КДК, будуць накіраваныя ў праваахоўныя органы.

Ларыса ШЫГАНАВА.

АЗБУКА ПОЛИТОЛОГИИ

Уроки Юрия Левады для Беларуси

На сайте "Левада-Центра" рядом с портретом в траурной рамке слова: "У нас огромное горе. 16 ноября 2006 года на 77-м году жизни в своем кабинете умер Юрий Александрович Левада". "У нас" — это не у сотрудников центра. "У нас" — это у всех тех, кто не привык воспринимать происходящее в обществе через "веселые картинки" многочисленных панорам и постскриптумов.

В поиске житейских радостей

Юрий Левада, по словам коллег, не был оптимистом. Знание умножает печаль. Профессиональное знание российского общества умножает печаль многократно. Но особенно печально, что твои знания невостребованны. И это в период кардинальных социальных перемен! Не случайно один из ведущих сотрудников "Левада-Центра" **Лев Гудков** недавно отметил: *"Написанное Левадой по-настоящему не прочитано. Состояние социальных наук в России таково, что умов, которые могли бы воспринять его идеи и концептуальные разработки, очень немного"*.

В России — немного. А в Беларуси? Наивный вопрос. Но дело даже не в качестве белорусских умов и не в их количестве, дело в отсутствии элементарной заинтересованности в идеях и концептуальных разработках как таковых. В условиях авторитарного режима единственный ресурс, в котором оппозиция не только может, но и обязана превосходить власть, — это ресурс интеллектуальный. Нет, в официальных кабинетах сидят не дураки. В официальных кабинетах сидят конформисты. Иначе кормиться годами с государственной идеологии или белорусской экономической модели невозможно.

Любимое детище оппозиционных лидеров — Конгресс. Один уже прошел, в конце марта должен состояться второй. Таким образом, рассуждая о Конгрессе, можно обращаться не только к будущему, но и к прошлому, что позволяет сделать тему Конгресса (обязательно с прописной буквы) самодостаточной. Согласитесь, из этого можно извлекать свои маленькие житейские радости.

Необходимость Конгресса объясняют не в последнюю очередь потребностью в общей стратегии. Именно на Конгрессе (где же еще?) ее следует разработать и принять. Что тут можно возразить? Лишь только то, что нигде и никогда на подобных вечевых мероприятиях ничего не разрабатывалось. Безусловно, Конгресс большинством голосов способен утвердить ту или иную стратегию, но для осознанного выбора делегатам необходимо предложить альтернативные варианты стратегий. Но от альтернатив, выскакивающих подобно чертикам из табакерок непосредственно перед Конгрессом, пользы особой не будет. Они должны стать результатом открытой дискуссии в оппозиционной среде.

С общественных дискуссий должны начинаться любые крупные коалиционные действия и опять же через дискуссии подводиться их итоги. К сожалению, на практике все происходит иначе. Итог президентской кампании был подведен практически за один день. Лидеры собрались. Лидеры поговорили. Неудивительно, что до сих пор нет точных цифр по поводу сбора подписей. А конкретные цифры могли бы о многом рассказать. В частности, ответить на вопрос, кто есть кто в ОДС и в каком звании.

Любая стратегия требует политологического обоснования, которое в свою очередь должно начинаться с анализа ситуации в стране. Нет обоснования, нет и стратегии. В лучшем случае набор лозунгов. Его с равным успехом можно предлагать как белоруским избирателям, так и жителям любой другой страны. Результат будет примерно тот же.

В доме, который построил Джек

Но чем в наших внутренних разборках может помочь Юрий Левада? В разборках ничем, а вот в понимании происходящего в Беларуси очень многим. Для этого достаточно процитировать последнюю статью российского социолога, опубликованную на сайте polit.ru. Но прежде чем это сделать, обратимся к отечественному изданию *("Белорусы и рынок" №46 от 27.11.2006)*: *"Лидер Партии БНФ Винцук Вечерко заявляет о том, что целью участия партии в местных выборах является мобилизация людей перед "социально-экономическими событиями", которые, как ожидает оппозиционный деятель, состоятся в следующем году"*.

Логика лидера БНФ понятна: Россия со следующего года сокращает свою "гуманитарную" нефтегазовую помощь режиму, наступает экономический кризис, который провоцирует социальную напряженность, который в свою очередь... Словом, как в известном стихотворении про "дом, который построил Джек", запускается последовательная цепочка неизбежных и взаимообусловленных событий.

А теперь предоставим слова Леваде. Его последняя статья уже одним своим названием ("Человек терпеливый") должна поубавить пыл политических детерминистов: *"Один из очевидных парадоксов современной российской действительности — широко распространенное, практически всеобщее недовольство происходящим в стране и собственной жизнью при сохраняющемся высоком уровне заявленного гражданами оптимизма и одобрения государственного руководства. Притом недовольства, которое практически не переходит в протест, тем более — в активный"*.

Недовольных своей жизнью сегодня в России хватает, активно протестующих — практически нет. Возможно, все дело в президенте Путине, уровень доверия которому зашкаливает за 70 процентов? Возможно. Но в 1999 году президенту Ельцину доверяли 5 процентов россиян. И что это изменило? По мнению Ю.Левады, отмеченный парадокс объясняется неорганизованностью недовольных. Разъединенные, атомизированные люди не способны на совместные действия, в том числе и протестные.

Подобное недовольство, если и артикулируется, то в основном в виде просьб, которые адресуются все той же власти, и желательно ее высшему уровню ("самому"). Итог подобного недовольства — *"в общественном воображении закрепляется тем самым ситуация вынужденного псевдо-патернализма"*, которую власть научилась использовать с выгодой для себя. Удивляться тут не приходится: *"Вынужденная апелляция недовольных групп к властям предержащим усиливает их зависимость от правящей бюрократии"*.

Заключительные слова

В статье "Человек недовольный" есть еще один важный вывод: в России массовые социальные требования в условиях экономического кризиса практически не соединяются с требованиями общедемократическими. Судя по результатам первых президентских выборов, в Беларуси развитие общественного недовольства в условиях кризиса 1994 года развивалось по сходному сценарию. Поэтому не случайно сумма голосов, полученных С.Шушкевичем и З.Позняком, совпала с долей демократического электората в белорусском обществе. Весь же протестный авторитарный электорат проголосовал за близкого им по духу популиста А.Лукашенко.

С тех пор в структуре белорусского общества принципиальных количественных изменений не произошло. Но это еще полбеды. Главная беда прошедших лет в том, что в демократической части общества *"не появилось даже зародышей "протестной" самоорганизации населения"* (Ю.Левада). Свою долю ответственности за это несут и политические партии, потому что формировать подобные "зародыши самоорганизации" — одна из важнейших партийных функций. Но подобная задача за последние 12 лет всерьез даже не ставилась.

Нет ее в планах объединенных демократических сил и сегодня. У политической кампании "Местные выборы" иная задача. По мнению организаторов, выборы предоставляют легальную возможность доносить несколько месяцев *"свои взгляды до людей"*. Иными словами, общество в очередной раз рассматривается как атомизированное скопление слушателей (читателей), которых необходимо просвещать.

Вот мы объясним бабе Дуне, в чем заключается ее подлинный интерес и кто является его выразителем, и она побежит (поковыляет) за нас голосовать. Ю.Левада смотрел на бабу Дуню иначе. Еще в начале 1990-х он понял суть проблемы: главной опорой прежнего тоталитарного или нынешнего полицейского режимов является человек, адаптировавшийся к насилию, даже не столько к внешнему, сколько к внутреннему.

Белорусское общество (по крайней мере, его большая часть) существенно отличается от общества западного. Просвещать его в стиле печально знаменитых народовольцев неэффективно, а ждать, когда в условиях экономического кризиса народ сам собой демократизируется, в результате чего "власть сама упадет оппозиции в руки", несерьезно. Одно из своих публичных выступлений Ю.Левада закончил словами (сегодня они воспринимаются как его завещание): *"Я понимаю, что у меня время исчерпывается. Мне остается сказать два слова на важную и, может быть, печальную тему: почему мы "не такие". Я думаю, что мы "не такие" и мы долго будем "не такими". Я думаю о двух способах перехода людей из одного состояния в другое. Один — это дифференциация, расслоение, выделение не просто значимых элит, но элит думающих, способных задавать цели, термины, способы действия, пускай и не слишком надежные. Второй вариант — это кристаллизация массы. То, что можно назвать общей или национальной мобилизацией"*.

В лице лидеров оппозиции мы имеем элиту выясняющую, выясняющую отношения между собой. Окажется ли она в состоянии перейти в элиту думающую, элиту, задающую цели и способы действия, покажет ближайшее время. Я же со своей стороны обязуюсь продолжить "Уроки Юрия Левады для Беларуси" в следующей "Азбуке".

Сергей НИКОЛЮК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 СНЕЖНЯ 2006 г.

ЭССЕ

Разрушая стену молчания

Людмила ГРЯЗНОВА

За каждой квартирной дверью, скромно обитой дерматином или одетой в железную броню, сборщика подписей ждет открытие. Казалось бы, стоит опасаться или, по крайней мере, стесняться стучаться в чужую дверь, но другого выхода для оппозиционных кандидатов в депутаты нет, поэтому смело напрашиваешься в гости, преодолевая личную робость и разрушая стену молчания между ближним и дальним соседом. Оказывается, отчуждение между людьми больше создается собственными страхами, а не усилиями пропагандистской машины.

И как только перед тобой открывается дверь, обнаруживается, что люди заждались — улыбки, сочувствия и просто общения: ни к чему не обязывающего, но только — не из "ящика". Говорящая голова с голубого экрана, похоже, теряет притягательность. Запутанные и корявые идеологические конструкции, проговариваемые официальными дикторами и комментаторами, не оставляют должного следа в смятенных душах рядовых обывателей. Вавилонские построения идеологов в совокупности с крикливыми выпадами политиков никак не ложатся успокоительным бальзамом на встревоженные сердца жильцов минских квартир.

Взгляд граждан обращается на скромного сборщика подписей, который вдруг становится желанной альтернативой — простой, доступной, открытой, без растопыренных пальцев и других лишних атрибутов. Оказывается, что обычные люди с двух-трех слов могут найти общий язык, увидеть друг в друге единомышленников, с пол-оборота найти государственное решение и почувствовать почву под ногами, осознать свое место в современном обществе и траекторию собственного полета в новой системе координат. И не в том смысле, что надо "сваливать" из этой страны, а в том значении, что надо здесь строить свой дом, убираться, приводить его в порядок, ремонтировать и даже перестраивать. Как говориться, "здесь Родос, здесь и прыгай" или проще, по-народному, "где родился, там и сгодился".

Безразличие, усталость и апатия, кажется, уходят в прошлое. Многие хлебнули эмигрантской жизни, может быть, сытой, но чужой, многим надоело спать и уподобляться мышкам-норушкам, годами не высовывая носа из собственных квартир — старых или новых, после евроремонтов. Чувствуется, что люди устали от одиночества, от замкнутого пространства и мечутся в поисках выхода, освобождения от комплексов и условных рефлексов, навязанных из "ящика".

Сборщик подписей, нежданный гость оказывается, как нельзя, кстати. С кем говорят, обмениваются сомнениями, утверждаются в несмелых, но абсолютно естественных, человеческих желаниях — быть вместе, чувствовать себя общностью, быть доброй силой, способной сопротивляться злу и мракобесию.

Многие десятилетия людям в нашей стране внушали стереотип послушания и покорности. Молчи и покоряйся власти в обмен на какой-то условный достаток и спокойствие. Но если бы этим общественный договор ограничивался! Если бы все люди жили по много лет и не умирали в зрелом возрасте, достойно доживая до старости! Но ведь этого нет. Не думала так грустно заканчивать это маленькое эссе, но ничего не могу поделать — под окнами моей квартиры прозвучала траурная музыка, и из соседнего подъезда вынесли покойника.

Апошні год дазвольнага штампа

Дазвольны запіс у нацыянальных пашпартах грамадзян Беларусі будзе адменены 30 снежня 2007 года. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Аляксандр Паўлоўскі.

Паводле яго слоў, адмяніць дазвольны запіс дапаможа ўвядзенне на ўсіх пунктах пропуску на беларускай мяжы аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю. Аўтаматызавана ўжо 70 працэнтаў пунктаў пропуску: на 50 працэнтах аўтаматызаваная сістэма ўжо дзейнічае, на 20 — пачне працаваць у найбліжэйшы час.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ВІЧ-успышка ў Талачыне

Кандидат педагогических наук в сфере фитнеса Светлана Кашицкая считает, что некоторым звездам белорусской эстрады и отдельным телеведущим, прежде чем появиться на экране, следовало бы сбросить лишние килограммчики...

С заместителем гендиректора спортивно-оздоровительного клуба "Мир фитнеса" Светланой Кашицкой мы говорили про моду на здоровый образ жизни.

Рот на замок и бегом в бассейн!

— Светлана, известно, что пик борьбы с лишним весом приходится на весну. Именно в этот период многие начинают изнурять себя всевозможными диетами. А зимой позволяют организму слегка расслабиться: мол, зачем ходить в тренажерный зал, если под шубами и дубленками складок на талии все равно не видно?..

— В этом смысле, конечно, наши люди уникальны: за 10 дней до поездки на отдых хотят сбросить все, что набрали за зиму! Но чудес не бывает. Поэтому могу дать простой совет: хотите уменьшить вес — меньше ешьте или больше двигайтесь. А в идеале — сочетайте и то, и другое. Если кто-то не имеет возможности посещать фитнес-зал, составьте список продуктов, от которых никогда не поправишься. Всюду носите его с собой и никогда не выходите за рамки этого перечня. Конечно, в этом списке никогда не будет написано *"торт"*, но если вы безумно захотите торта, то съешьте его одну столовую ложку. А если вдруг сорвались и съели целый кусок — потратьте эти калории. Сделайте пробежку, заплыв, попрыгайте на скакалке. Однако если вы всю жизнь хотите быть в форме, вам придется есть только то, что никогда не приведет к увеличению веса: паровую рыбку, фрукты, курицу. В этом списке не будет ни колбасы, ни конфет, ни макарон с соусами, жареного.

— То есть вместо тренажерного зала можно пойти к диетологу, попросить его составить рацион — и отличная фигура обеспечена?

— Сев на диету, можно похудеть. Но вопрос в другом — будет ли ваше тело упругим? И еще одна проблема: к сожалению, в Беларуси нет профессиональных диетологов. А если и есть, то лично я не знаю, где их искать. Их никто не рекламирует. И в обычных районных поликлиниках они не консультируют.

Я медик по образованию и знаю, как может навредить самодеятельная диета, вычитанная в каком-то журнале. Поэтому все должно быть под контролем врача. Но самое страшное, что после диеты многие начинают питаться так, как привыкли, и еще больше набирают вес! Поэтому я выступаю за правильное питание, которое может позволить себе каждый. Плюс обязательная физическая нагрузка. Потому что при диетах кроме жира теряется еще и мышечная масса. И вы можете быть стройненькой, но с целлюлитом...

— А как Вы относитесь к разрекламированной кремлевской диете?

— Если она вам подходит — то почему бы и нет? Я видела неплохие результаты этой диеты. Например, директор студии моды Сергей Нагорный сбросил на "кремлевке" около 20 килограммов. Правда, он ее слегка усовершенствовал: ничего не ел после шести часов вечера. И вообще не употреблял алкоголь. Я считаю, он стал просто красавец. Сергей не набирает лишний вес уже как минимум год.

— Интересно, а кого сегодня больше волнуют проблемы собственной фигуры — мужчин или женщин?

— Женщин, конечно, больше. Но и мужчины также достаточно внимания уделяют фигуре и здоровью, развивают свою выносливость. Некоторые ходят в спортклуб ежедневно и, отзанимавшись в тренажерном зале, идут в кардиозал, на групповые занятия, танцы, затем в парилку, бассейн и на массаж.

Куда пойти, кому отдаться?

— Сейчас все буквально помешались на новых направлениях фитнеса: пилатесе, танец живота, аквааэробике. Как по-Вашему: если много лет ходишь в тренажерный зал и доволен результатами, то стоит ли пускаться в эксперименты?

— Я положительно отношусь к экспериментам, ведь непросто удержать интерес к одному и тому же направлению. И кому-то нравится сначала позаниматься танцем живота, а потом попотеть в тренажерном зале. Это разные направления, соответственно, они дают разные результаты. Пример из жизни: моим клиентам надоело заниматься только аэробикой, и они пошли в тренажерный зал. А потом снова вернулись ко мне. Они не бросали тренировки, занимались три раза в неделю. Но на аэробике сотый раз ногу поднять не могли! И удивляются — мол, как так, мы же тренировались! Все дело в том, что это абсолютно разные виды нагрузок...

Мне, например, близка аэробика и я искренне могу сказать, что не люблю качаться в тренажерном зале и заниматься бегом. Но я точно знаю, что это эффективно. И поэтому для достижения наилучшего результата заставляю себя делать все в комплексе.

— В Минске огромное количество самых разных спортклубов. Как выбрать лучший?

— Не верьте, если говорят: в том зале плохо. Лучше проведите там целый день и посмотрите, устраивает ли вас профессионализм инструктора, эффективность тренировок, сервис, комфорт, оснащенность зала, программа, которую вам составили. Все это очень важно. Нужно прийти, отзаниматься и сказать — понравилось или нет.

Экономить на здоровье нельзя

— Кстати, о ценах. Средняя зарплата белорусов — около 200 долларов. За абонемент на шейпинг во Дворце водного спорта придется отдать около 30 долларов. Одно персональное занятие с тренером в обычном тренажерном зале обойдется в 10 долларов. Да и в "Мире фитнеса" годовой абонемент стоит около двух миллионов рублей. Дорого...

— Если не ошибаюсь, в Минске нет абонементов дешевле 50—60 тысяч в месяц. Но за эти деньги вы запросто можете оказаться в каком-нибудь подвале, где не будет вентиляции и где может быть грязно. И самое страшное — вы можете попасть к тренеру без медицинского или физкультурного образования. Вы станете делать то, что говорит такой наставник, а через некоторое время у вас начнет болеть поясница. И в конце концов окажется, что вам противопоказаны эти упражнения. Я не утверждаю, что так везде. Я говорю, что велика опасность, потому что видела подобное не один раз. У инструктора такая же первая заповедь, как и у врача, — *не навреди*.

А если говорить о наших ценах, то мы их не скрываем. Например, у нас есть абонемент "Минима". Он рассчитан на три месяца и стоит 303 600 рублей. Его обладатель может проводить в центре пять часов в день, бывать не в одном зале. А если взять наш годовой абонемент, то один день без бассейна обойдется примерно в 3000 рублей, с бассейном — чуть меньше 6000. Возможно, людей пугает большая сумма. Но если поделить общую сумму на количество посещений, то это совсем не дорого. "Мир фитнеса" — это клуб, который доступен всем. Причем у нас абонемент можно выкупить в рассрочку и в кредит.

— Значит, Вы не поддерживаете распространенное в определенных кругах мнение о том, что фитнес — это забава для людей состоятельных?

— Конечно нет. Фитнес — естественная необходимость для каждого, кто думает о здоровье и культуре тела. Я выступаю за то, чтобы человек встал с дивана, перестал есть чипсы и начал заниматься любым видом фитнеса. Я выступаю за то, чтобы народ был более активным. Хочу, чтобы люди делали зарядку по утрам, плавали в бассейне. Но зачастую находится много причин, чтобы отложить утреннюю пробежку. А купив абонемент в фитнес-центр, вы вряд ли пропустите занятие — это же ваши деньги!

— Нарисуйте, пожалуйста, портрет клиента "Мира фитнеса": уровень достатка, образование, род занятий и т.д.

— Люди с высшим образованием. Те, кто много работает. Студенты, менеджеры, руководители крупных предприятий, государственные, общественные и культурные деятели.

— А как же рабочий класс? Например, фрезеровщицы или токари к вам заходят?

— Честно говоря, не знаю...

— Вы говорили о заповеди *"Не навреди"*, одинаковой для врача и инструктора. Ни в одном спортклубе я не встречала врача. А ведь очень важно знать, например, на каком максимальном пульсе можно работать, а тем, у кого проблемный позвоночник, — в каком положении качать пресс...

— В стоимость нашего абонемента входит обязательная консультация врача, который протестирует вас и порекомендует индивидуальные виды нагрузок. Кроме того, мы предлагаем мониторинг интенсивности тренировки. И всегда предупреждаем: если долго не тренировались, ни в коем случае не идите на урок высокой интенсивности, увеличивайте нагрузку постепенно.

— Судя по тому, что фитнес-центры возникают, как грибы после дождя, продавать здоровый образ жизни — достаточно прибыльное занятие?

— Не настолько прибыльное, как думают некоторые. К тому же в Беларуси немного хороших фитнес-центров. Далеко не во всех клубах стоит качественное оборудование, некоторые в целях экономии предпочитают покупать "советские" тренажеры, которые давно уже устарели. Я считаю, что экономить на здоровье нельзя.

Смерть на подиуме

— На днях на Неделе моды в Монтевидео прямо на подиуме умерла 22-летняя модель. Говорят, от недоедания. Это еще больше оживило дискуссию по поводу чрезмерно худых моделей, которые, по мнению некоторых, не должны участвовать в показах. Что Вы об этом думаете?

— Я сама была директором модельного агентства "Мо" и великолепно знаю, что модели должны быть не просто стройными, а именно худыми. Это одно из условий модельного бизнеса. Но я против того, чтобы девочки совсем переставали есть. Это ненормально и опасно. Но не путайте модельный бизнес с вопросами коррекции телосложения обычных людей. Здесь я против каких-то строгих параметров. Мне нравится понятие *"вес наилучшего самочувствия"*, когда ты себя хорошо чувствуешь в определенном весе, когда с удовольствием смотришь на свою фигуру в зеркало, отсюда — и хорошее настроение, и дополнительная энергия.

— Когда-то у Вас было не только агентство моделей, но и агентство по организации торжеств "Лимузин". Что с ним теперь?

— Оно по-прежнему работает.

— И что сейчас пользуется большим спросом: фитнес или праздники?

— Люди мало хотят тратиться на праздники. И не умеют их устраивать. Хотя для праздника нужны не столько деньги, сколько фантазия и энтузиазм. Фитнес ж пользуется большим спросом.

— Западные ученые пришли к выводу, что регулярные занятия фитнесом по своему воздействию на человеческую психику не менее опасны, чем наркотики, никотин или алкоголь. И, например, в Италии зависимостью от фитнеса страдают полмиллиона человек. Вам приходилось сталкиваться с такими людьми?

— Зависимость от фитнеса в хорошем смысле этого слова — это здорово! Другое дело, когда человек весит 45 килограммов и кажется себе толстым. Это уже действительно нездоровая зависимость. Но такие люди, как правило, не посещают спортклубы.

Чернослив и обезжиренный йогурт вместо конфет

— Как человек, который ведет здоровый образ жизни, о чем Вы думаете, когда видите по телевизору рекламу МакДоналдса?

— Расскажу забавный случай. Моей дочери три года. Она, когда видит букву, обозначающую МакДоналдс, говорит: *"Жаба"*. Почему — не знаю.

Честно могу сказать, что я не приветствую еду из МакДоналдса. На мой взгляд, она невкусная и от нее поправляешься. И своего ребенка я в МакДоналдс не вожу. Я вообще стараюсь не давать Александре нездоровую еду. Приучаю к тому, чтобы вместо конфет она просила чернослив. Правда, конфеты она все равно просит, но я хитрю: даю ей мятные или клюкву в сахарной пудре. Когда дети дали ей попробовать кока-колу, она сказала: *"Фу!"* Ей вкусно кушать приготовленную на пару без всяких соусов рыбу. Я, конечно, готовлю ей макароны, но никогда не делаю их с сыром, соусами, мясными добавками.

— У бизнес-вумен Кашицкой всегда находится время для готовки? В российских новостях недавно озвучили любопытную статистику: 75 процентов британцев в возрасте до 35 лет настолько привыкли к полуфабрикатам, что умеют только разогревать пищу...

— Некоторые мои знакомые тоже отдают предпочтение полуфабрикатам. Потому что для них большая проблема приготовить, например, паровую рыбу. Я же люблю готовить, собираю интересные рецепты. Но с радостью пошла бы на курсы поваров, чтобы научиться готовить правильную и здоровую пищу. К сожалению, люди порой не задумываются о том, из чего готовят и что едят. Покупают, например, йогурты с повышенным процентом жирности. Но если ты хочешь похудеть — посмотри на цифры, не бери 10-процентный йогурт, ведь есть и 0,3, и 0,1-процентные, обезжиренные. То же самое можно сказать и про сметану и майонез. Я считаю, что в Беларуси об этом мало говорят, в том числе и с экрана телевизора.

«Свет мой, зеркальце, скажи...»

— Обезжиренные продукты явно не по душе некоторым представителям публичных профессий. Например, недавно у ведущей "Добрай раніцы, Беларусь!" Светланы Боровской появился партнер по эфиру, которому не помешало бы сесть на диету. Лишние килограммчики, наверное, стоило бы сбросить и лидеру "Леприконсов" Илье Митько, солистам "Тяни-Толкай" и другим...

— Конечно же, на вкус и цвет товарищей нет. И я прекрасно понимаю, что многим женщинам нравятся мужчины с животиком, потому что на нем можно удобно полежать. А некоторые мужчины симпатизируют девушкам с формами, а не худосочным барышням. Я никогда не говорю о том, что женщина с пышными формами должна резко стать худой. Но считаю, что публичные люди должны следить не только за своим поведением, но и за своим телом. Даже если ты большой человек, у тебя все равно должны быть талия, бедра, мышцы. Поэтому некоторым известным персонам на самом деле стоит сесть на диету. Многие, кстати, уже активно худеют. Например, Галина Шишкова, Дмитрий Шунин, музыканты группы "Тяни-Толкай".

— Светлана, а Вы довольны своей фигурой?

— Я стараюсь относиться к себе критически. Но благодаря тренировкам и увлечению спортом я ощущаю себя и моложе, и красивее.

— Теперь Вы занимаете руководящую должность и, к сожалению, уже не тренируете. А сами с кем занимаетесь?

— Я тренируюсь и самостоятельно, и с инструкторами. Честно говоря, люблю ощущать себя в роли маленькой девочки, которая, выполнив одно упражнение, спрашивает у тренера: *"А что мне делать дальше?"* Я во время тренировок хочу находиться под постоянным присмотром профессионалов.

— Вы вошли в список самых красивых и успешных людей Беларуси. По-Вашему, нужны ли подобные проекты?

— Не скрою, мне было приятно об этом узнать. Тем более что меня не назначили самой красивой и успешной, а выбрали голосованием. Приятно, когда люди замечают твое стремление все время идти вперед.

Я считаю, что подобных проектов должно быть больше. Признание — это очень важная штука. Причем отмечать нужно не только положительное, но и отрицательное. Это стимулирует.

— Никогда не жалели, что ушли из медицины?

— В первые годы мне действительно было сложно. Но потом сама себе сказала: знания, полученные в мединституте, не пропадут, если я их буду умело использовать в своей дальнейшей деятельности. Так и случилось. Мне медицинское образование помогает и в жизни, и в работе.

— Вы были первым человеком, защитившим кандидатскую в сфере фитнеса. Трудно было пробить тему?

— Да, трудно. У нас мало специалистов, которые все знают про аэробику и фитнес. Не создано профессиональных обучающих школ по фитнесу на государственном уровне. Люди по-дилетантски подходят к этому вопросу. А я настаиваю на том, что к фитнесу нужно подходить и с научной точки зрения.

— Можно сказать, что в Беларуси сейчас мода на здоровый образ жизни?

— Во всяком случае такая тенденция наметилась...

ПОЛЕЗНЫЙ СОВЕТ

Не находите времени на занятия?

Это самая распространенная отговорка. Подумайте о том, что вы обязательно находите время на то, что вам приятно делать. Здоровым быть приятно. Осознав это, вы и не заметите, как появится привычка тренироваться.

Статистика свидетельствует, что семейные пары, занимающиеся спортом вместе, тренируются наиболее постоянно и эффективно.

Помните, что в неделе 168 часов. И если вы будете заниматься три раза в неделю по два часа, то это всего 3,5 процента от всего времени: неужели вы не можете их потратить на себя?..

ЛИКБЕЗ

Что такое...

Fitness. Слово "фитнес" происходит от английского глагола "быть в форме". "Fitness" означает выносливость, натренированность, хорошее состояние здоровья. Главное — не путать фитнес с физкультурой, а тем более — спортом.

Цель занятий спортом — достижение наилучших результатов по сравнению с коллегами. Физкультура — это всестороннее укрепление и совершенствование человеческого тела при помощи физических упражнений. Понятие "фитнес" — шире. Оно восходит к современному пониманию античного стремления к достижению внутренней гармонии человека и внешней красоты его тела. Фитнес — это образ жизни, который принято называть здоровым.

Pilates. Система упражнений, направленная на укрепление мышечного корсета, при минимальной нагрузке на позвоночник.

Flex. Комплекс упражнений, направленный на растягивание мышц и релаксацию.

Tai-chi. Древняя дыхательная гимнастика. Утонченная система упражнений для тела и разума. Методика представляет собой систему медленных и сосредоточенных движений, попеременного напряжения и расслабления мышц.

Yoga. Психофизическая практика, основанная на древних индийских традициях. Занятия направлены на гармонизацию тела и души.

Беговая дорожка считается одним из самых эффективных методов сжигания жира.

Велотренажеры прекрасно развивают выносливость, укрепляют сердечно-сосудистую систему, а заодно тренируют мышцы ног и спины.

Эллиптические тренажеры — считается, что "эллипсовидный шаг" позволяет создать высокую нагрузку и целенаправленно воздействует на "проблемные" зоны, особенно мышцы ног, ягодиц и бедер, при незначительной нагрузке на колени, суставы и позвоночник.

Степпер (шаговый тренажер) — успешно выполняет не только общие для всех кардиотренажеров функции, но и наиболее активно тренирует мышцы ног и таза.

Гребные тренажеры — эффективны для развития выносливости и силы позволяют работать практически всем мышцам тела (ног, рук, ягодиц, пресса, спины и груди).

Цена здоровья

Тренажерный зал, шейп-зал (месяц занятий) -- 60 тысяч

Годовой абонемент в фитнес-клуб — от 300 у.е.

Аквааэробика (8 занятий в месяц) — 55 тысяч

Пилатес -- 60 тысяч

Танец живота — от 50 тысяч

Массаж в фитнес-клубе (в зависимости от вида и длительности сеанса) — от 6 до 20 у.е.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 СНЕЖНЯ 2006 г.

ЗОРКІ Ў ГАСЦЯХ У «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Сяргей МАРТЫНАЎ:

«Зачахляць зброю не збіраюся»

На сёлетнім чэмпіянаце свету па кулявой стральбе, што праходзіў у Харватыі, беларус Сяргей Мартынаў заваяваў залаты медаль. Гэта першы падобны поспех у кар'еры шматвопытнага спартсмена, хаця ў камандных спаборніцтвах Сяргей на падобных турнірах ужо чатыры разы заваёўваў золата. Акрамя таго, у актыве спартсмена два сярэбраныя алімпійскія медалі — у Сіднеі і Афінах.

Дарэчы, Мартынаў першым з беларускіх спартсменаў-стралкоў заваяваў алімпійскую ліцэнзію для ўдзелу на спаборніцтвах у Пекіне. З гэтага і пачалася наша размова.

Як прызнаецца сам спартсмен, менавіта алімпійскія ўзнагароды для яго вельмі дарагія.

— Дзве алімпійскія бронзы атрымаліся для мяне рознымі. Калі ў Сіднеі хутчэй быў расчараваны сваім трэцім месцам (шчыра кажучы, думаў, што алімпійскае золата ўжо ў кішэні, аднак у фінале стральба не заладзілася), то ў Афінах стаў на трэцюю прыступку п'едэстала хутчэй насуперак: напярэдадні афінскіх гульняў на сур'ёзных турнірах нават ні разу ў фінал не трапляў. Мяняў вінтоўку, патроны, амуніцыю... У рэшце рэшт, "неабходнае" спалучэнне было падабрана. Рады, што атрымалася зачапіцца за медаль.

— А на апошнім чэмпіянаце свету на медаль таксама разлічвалі?

— Добра ўсё атрымалася. Заваяваў золата. Але для мяне гэта проста чарговы медаль. Спорт ёсць спорт. Стральба, як і іншыя віды спорту, прагнозу не паддаецца. Ты можаш быць увесь медалямі ўвешаны, а калі стральба не пойдзе, то ўжо нічога не зробіш. Вось, напрыклад, узяць апошнюю Алімпіяду ў Афінах. У фінале страляў амерыканец, і адзін алімпійскі залаты медаль у яго на той момант ужо быў. Аднак знянацку ён узяў ды і пачаў страляць не ў сваю мішэнь. Нервы здалі...

Калі ж вяртацца да апошняга чэмпіянату свету, то скажу шчыра: асаблівых уражанняў ён у мяне не пакінуў. Стральба як стральба...

— Ну а фінансавы стымул?..

— Міжнародная федэрацыя стральбы ніякіх прызавых не выплачвае. Па-крайняй меры за перамогі на чэмпіянатах свету. Прэміяльныя атрымліваў толькі ў Беларусі — як за сусветныя спаборніцтвы, так і за алімпійскія медалі.

— Карацей кажучы, стралкам на жыццё ў Беларусі скардзіцца не прыходзіцца?

— За ўсе стралковыя школы краіны адказваць не буду, здагадваюся, што ў дзіцячых школах ёсць пэўныя праблемы і са зброяй, і з аплатай працы трэнераў. Ды і на ўзроўні нацыянальнай зборнай краіны пэўныя праблемы таксама існуюць, аднак яны заўжды вырашаюцца.

— Сяргей, Вы страляеце толькі на спаборніцтвах ці разпораз заходзіце ў цір якога-небудзь парку культуры і адпачынку, каб там сабраць усе прызы?

— Не, паркавыя ціры на прызы не абанкручваю. Там зброя не заўжды добрая, можна і ў мішэнь не патрапіць... (*Усміхаецца*. — **Аўт.**). Няхай дзеці забаўляюцца, а мне стральбы і на прафесійным узроўні хапае.

— Дарэчы, ці шмат дзяцей зараз маюць ахвоту займацца стральбой?

— Жадаючых хапае, але страшэннага ажыятажу не назіраецца. Я і сам у стральбу трапіў выпадкова. Да таго як прыйсці ў цір, спрабаваў займацца рознымі відамі спорту — веславаннем, акрабатыкай... Акрабатыкай, напрыклад, займаўся адзін дзень, там мяне так замучылі, што ўсё балела. Пасля таго і вырашыў: у спартзалу — ні нагой.

У нашым дзяцінстве было няшмат забаў. Гэта сённяшнія дзеці з-за камп'ютэра не падымаюцца, а ў нас гэтага не было. Ну а што хлопцу трэба? Пастраляць — вось гэта забава. У цір хадзілі чалавек па восемдзесят. Праўда, не ўсе заставаліся. Так скажам, праходзіў натуральны адбор. Мне спадабалася, я застаўся. Дагэтуль страляю.

— У Вас дзве дачкі. Хочаце, каб яны пайшлі па Вашым шляху?

— Хай самі вырашаюць. Пакуль яны плаваннем займаюцца — пайшлі шляхам маёй жонкі Аксаны. Мы і пазнаёміліся, якраз калі яна хадзіла на трэніроўкі па плаванні.

— Сяргей, напэўна любы стралок у душы паляўнічы. На паляванне часта ездзіце?

— Памылковае сцвярджэнне. Не люблю паляванне і ні разу там не быў — ні ў якасці паляўнічага, ні ў якасці гледача. Мне больш даспадобы рыбалка: пасядзець на беражку, супакоіцца... І для мяне не важна, якога памеру рыбіну я выцягну. Зацягвае сам працэс.

— Спакойны чалавек Сяргей Мартынаў застаецца такім і на спаборніцтвах?

— А чаго асабліва нерваваца? Хваляванне, канечне, прысутнічае... Уздымаючы вінтоўку, стараюся не думаць аб выніку, лепш на нейкія іншыя тэмы. Ведаю, што вось я, а там мішэнь, а як трапіць куля — пакажа "электроніка".

— Гэта значыць стральбу, у адрозненне ад фігурнага катання ці гімнастыкі, нельга аднесці да "суб'ектыўных" відаў спорту?

— Чалавечы фактар на сённяшні дзень у стральбе адсутнічае — усё робіць электроніка. Аспрэчыць рашэнне камп'ютэра тэарэтычна можна, аднак пры спробе спартсмен, як правіла, адразу пазбаўляецца двух ачкоў. Таму спрачацца бессэнсоўна.

— Сяргей, золата чэмпіянатаў свету ў вашай медальнай скарбонцы ўжо ёсць. Вось з алімпійскім медалём такога ж гатунку неяк не складваецца: бронза і бронза... Як думаецце, у Пекіне ўдасца перарваць традыцыю?

— Хто ж пра гэта не марыць?! Але да Алімпіяды ў Пекіне яшчэ шмат часу. Наперадзе шмат адказных стартаў, аднак на галоўных, на тых, што раз у чатыры гады, канечне ж, хацелася б выступіць выдатна. Аднак, паўтаруся, прагнозы ў спорце — справа няўдзячная.

Бліц

— Любімая страва?

— Ем усё, не перабіраю.

— Любімая музыка?

— Дакладна не беларуская і расійская папса.

— Любімая літаратура?

— Тое самае, што і са стравай. Праўда, вялікім кнігалюбам не з'яўляюся.

— Ваша хобі?

— Люблю більярд. Спакойная гульня.

— За рулём Вы ліхач?

— Не, аднак правы ў ДАІ забіраць даводзілася. Не заўважыў абмежавальнага знака.

— На вуліцах пазнаюць?

— Рэдка. Я ж не хакеіст і не футбаліст.

— Чым збіраецеся заняцца пасля завяршэння спартыўнай кар'еры?

— Ай, не думаў я пра гэта. Зброю зачахляць пакуль не збіраюся.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Андрэя ВАШКЕВІЧА.

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Сяргей МАРТЫНАЎ: нарадзіўся ў 1968 годзе ў Брэсце. Спартсмен-інструктар спартыўнага камітэта Узброеных сіл Беларусі, майстар спорту міжнароднага класа. Вайсковае званне — падпалкоўнік. Неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен свету па кулявой стральбе. У 18 гадоў стаў чэмпіёнам Спартакіяды СССР. Дэбютаваў на Алімпійскіх гульнях у Сеуле ў 1988 годзе. Бронзавы прызёр Алімпіяды-2000 у Сіднеі і Алімпіяды-2004 у Афінах.

ФУТБОЛ

За Глеба мы яшчэ атрымаем...

Па інфармацыі, якая прыйшла з Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола", Палата па вырашэнні канфліктаў ФІФА задаволіла заяву беларускай федэрацыі і абавязала лонданскі "Арсенал" у тэрмін да 27 снежня 2006 года выплаціць у адпаведнасці з механізмам салідарнасці ФІФА нашай СДЮШАР "Дынама" (Мінск) кампенсацыю за пераход Аляксандра Глеба з нямецкага "Штутгарта" ў англійскі "Арсенал".

Датычна сумы кампенсацыі адказныя работнікі нашай федэрацыі адзначаюць, што яна будзе больш чым дастатковай для таго, каб укласці сучаснае штучнае пакрыцце замест асфальта, на якім вымушаны займацца юныя дынамаўцы.

Пераемнікі Пунтуса

Нагадаем, што пасля завяршэння футбольнага сезона-2006 пасаду галоўнага трэнера МТЗ-РІПА пакінуў Юрый Пунтус. Ён засяродзіўся на працы з нацыянальнай зборнай Беларусі.

Сярод кандыдатаў на пасаду "рулявога" сталічнай каманды называюцца трэнер дубліруючага складу маскоўскага "Спартака" Міраслаў Рамашчанка, былы трэнер мінскага "Дынама" і зборнай Беларусі Эдуард Малафееў, а таксама памочнік Пунтуса па МТЗ-РІПА Уладзімір Курнеў. Дарэчы, менавіта апошняга рэкамендаваў сабе ў пераемнікі сам Пунтус.

Туміловіч вяртаецца

Дакладна вядома, што былы галкіпер зборнай Беларусі Генадзь Туміловіч вернецца ў мінскае "Дынама". Кантракт з расійскім "Луч-Энергія" ў 35-гадовага беларуса заканчваецца ў гэтым месяцы. Заставацца ва Уладзівастоку ён не намераны. Туміловіч прыняў рашэнне вярнуцца ў Беларусь. Магчыма, што ў мінскім "Дынама" ён будзе сумяшчаць адразу дзве пасады — дзеючага варатара, а таксама трэнера галкіпераў сталічнай каманды.

ШАШКІ

Нечаканы выйгрыш

Двойчы чэмпіён Беларусі, майстар спорту гамяльчанін Яўген Кандрачэнка наведаў у Кіеве свайго сябра і трэнера — міжнароднага гросмайстра Аляксандра Касэнку і згуляў з ім матч з 70 бліц-партый. Перамог украінскі маэстра з лікам +23-10=37. Трэба адзначыць, што А. Касэнка — лепшы ігрок у бліц на ўвесь былы СССР. Вось гэта настаўнік! Вам будзе карысна пазнаёміцца з наступным эпізодам, у якім здольны вучань знайшоў нечаканы выйгрыш:

Белыя (А.Касэнка): a3, c3, d2, e3, f2, f4, g3, h2 (8). **Чорныя:** (Я.Кандрачэнка): a7, b6, c5, c7, d6, e7, h4, h6 (8).1 ... cd4! 2. e:c5 (2. c:e5 bc5x) b:b2 3. a:c1 dc5! 4. dc3 (больш упарта было 4. fe5) ab6 5. cb2. Далей перавагу за чорных пашукайце самі.

Таго, хто прышле самы аптымальны адказ, чакае сюрпрыз — кніга А.Касэнкі і Я.Кандрачэнкі "Избранные партии гроссмейстера И.И.Купермана и современная теория" (Гомель, 2006). Выданне вельмі каштоўнае — і не толькі для практычных гульцоў, але і для шашачных кампазітараў, бо Ісэр Куперман (1922—2006) адкрыў шмат новых камбінацыйных і эцюдных ідэй у шашках-64. Разгледзьце канкрэтныя прыклады:

1.Белыя: d2, e1, f2, f4, g3 (5). **Чорныя:** d4, d6, f6, f8, h4 (5). 1. fe3! h:f2 (1 ... d:f2 2. de3 3. fg5 4. g:g1x) 2. e:g5 fg1 3. ef2 4. gh6 5. h:f4 fe7 6. fe5x. Апазіцыя 1 на 1.

2.Белыя: c1, c3, e1, e3, f2, g3 (6). **Чорныя:** c5, c7, e5, g5, h4 (5). Ход белых, яны праводзяць прыемны манеўр на сваю карысць. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Дарэчы, многія сучасныя складальнікі паўтараюць гэтыя канструкцыі, не ведаючы, што іх аўтарам з'яўляецца І.Куперман.

Больш падрабязную інфармацыю аб змесце вышэйзгаданага вучэбнага дапаможніка можна атрымаць, калі патэлефанаваць у Гомель Я.Кандрачэнку (8-0232-62-18-87).

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34А, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**



Спаборніцтвы па шашках-64

У Якуцку адбыўся чэмпіянат свету па шашках. На жаль, наш міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк (Гродна) сваё мінулагодняе чэмпіёнскае званне ўступіў у матчы з Георгіем Колесавым, прычым датэрмінова, бо расіянін — самы вопытны баец менавіта ва ўласных сустрэчах з самымі моцнымі сваімі канкурэнтамі ў барацьбе за шашачную карону. Гэтая яго адметная якасць дазволіла яму параўнальна лёгка стаць найлепшым шашыстам планеты ў шосты раз.

Аднак і Г.Колесаў яшчэ не ўсё бачыць за клетачнай дошкай. Напрыклад, адну з партый ён давёў да пройгрышнага становішча:

Белыя (А.Валюк): c1, d2, d4, e1, e3, e5, f4, f6, g3 (9). **Чорныя** (Г.Колесаў): a3, a5, b4, b6, c5, d8, g7, h6 h8 (9). 1. fe7! 2. ef2 bc3 (2 ... fg5 3. gh4x) 3. d:d6 ab4 4. gh4 bc5 5. d:b6 6. e:c5 bc3 7. dc7x. Андрэй жа чамусьці пайшоў 2. gh4? bc3 3. d:d6 bc5 4. d:b4 a:c5 5. d:b6 f:f2 6. e:g3 a:c7=.

***

У Расіі (Санкт-Пецярбург) ладзілася 1-я Сусветная юнацкая алімпіяда. Сёстры Дар'я і Вольга Федаровіч прывезлі ў Мінск сярэбраную ўзнагароду ў камандным заліку.

***

Як паведаміў экс-чэмпіён Беларусі Вільям Астрынскі — пастаянны карэспандэнт нашай рубрыкі "Шашкі", у маладзёжным першынстве краіны, які сабраў звыш 70 удзельнікаў, прызавыя месцы занялі: сярод юнакоў — 1. Андрэй Толчыкаў (Гомель), 2. Антон Гуркоў (Мінск) і 3. Яўген Маеўскі (Гродна); у дзяўчат — 1. Вольга Федаровіч (Мінск), 2. Ганна Крашко і 3. Алена Кірылава са Слоніма.

***

У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках мінскія кандыдаты у майстры спорту правялі два турніры па маланкавай гульні. У першым з іх вызначыліся Уладзіслаў Гурэцкі, Анатоль Судакоў і В.Астрынскі, у другім — В. Астрынскі, Барыс Абрамаў і Ігар Ліпай.

Супаставім рашэнні

Давайце іх зверым на раней змешчаных пазіцыях.

"Адметнае правіла". Міні-конкурс-51 (М. Грушэўскі): 1. gf4 ac5AB 2. fg5 cf8 3. ef6 fh6 4. ab6! h:a7 (у бразільскіх шашках біць большасць фігур абавязкова) 5. fg7 ad4 6. gf8=. B1 ... de7 2. fg5 ed6 3. gf6/h6 4. fg7 ad4 5. gf8=. A1 ... ab8 2. ab6! 3. ef6 4. fg7 ge5 5. gf8=. Па правілах жа рускіх шашак: 1. gf4 ac5 2. fg5 cf8 3. ef6 fh6 4. ab6 c:a5!x.

"Чэмпіянат Беларусі": №2 (У.Мурашка—А.Ляхоўскі). Да нічыёй вёў і 1. cd4 cb4 2. dc5 fe7! 3. c:a3 dc5 4. h:b4 a:a1=. 3. h:f8 fg5 4. c:a3 dc5=. Каментарый належыць Аляксандру Ляхоўскаму (Жодзіна), чэмпіён краіны перадаў нам яго па тэлефоне; **№3** (В.Талкачоў—Л.Козел). 1 ... ba7 2. d:d8 ba5 3. d:h4 hg5x. 2. d:h4 hg5 3. h:d8 ba5x.

Першымі правільныя рашэнні даслалі: Аляксандр Перавознікаў і Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Іван Працук (Паставы), Мікалай Клязовіч (Жодзіна), Вольф Рубінчык (Мінск) і іншыя.

"Дзякуй за цікавы аддзел!" — вырашыў выказаць падзяку вядучы рубрык "Каіса" і "Нашы шашкі" газеты "Наша Ніва" В.Рубінчык.

Міні-конкурс-51 выйграў А.Перавознікаў, які справіўся і з заданнем №12 класіфікацыйнага конкурсу-20. Яму высылаецца прыз нашага бескарыслівага аўтара У.Сапяжынскага — кніга В.Звірбуліса і Р.Здаравяка "Типичные шашечные приемы" (Москва, "Физкультура и спорт", 1988).

Мікалай ГРУШЭЎСКІ, майстар спорту.

ШАХМАТЫ

Решите задачу
Э.Делалио

Белые: Kpd5, Фb1, Cg5, Kf4, п. g2 (5).

Черные: Kpd2, п. e4 (2).

Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу-миниатюру французского шахматного композитора Эммануэля Делалио. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Сверьте решение

Композиция Виктора Вовнейко (опубликована 5.10.): **1.Фе8!**

«Веснянка» идет вперед

В Австрии проходило первенство Европы по шахматам среди клубов. В турнире, проводившемся по швейцарской системе в 7 туров, приняли участие 56 команд из большинства европейских стран. В каждой команде играли 6 спортсменов. Победители первенства определялись по наибольшему количеству набранных очков. Причем за выигрыш матча, независимо от счета, давали 2 очка. Лишь при подведении итогов, в случае равенства командных очков, учитывались все очки, набранные членами команды. В соревновании выступали сильнейшие гроссмейстеры мира.

В острейшей борьбе Кубок Европы завоевала команда "Томск-400", за которую играли гроссмейстеры Александр Морозевич, Дмитрий Яковенко (Россия), Виорел Бологан (Молдова), Владислав Ткачев (Франция), Эрнесто Инаркиев, Павел Смирнов (Россия). Результат победителей — 12 очков, всего членами команды набрано 30 очков. Серебряными призерами стали шахматисты команды "Ладья" из Казани — 12 очков (26,5). Эту команду возглавляли гроссмейстеры Теймур Раджабов (Азербайджан), экс-чемпион мира ФИДЕ Рустам Касымжанов (Узбекистан), Артем Тимофеев (Россия). Бронзовые награды достались команде "Урал" из Екатеринбурга — 12 очков (26,5). За "Урал" выступал воистину звездный состав: неоднократный чемпион России Петр Свидлер, Алексей Широв (Испания), Владимир Акопян (Армения), Александр Грищук, Владимир Малахов, Алексей Дреев, Константин Сакаев (все из России). В занявшей четвертое место команде "Ашдод" из Израиля выступали гроссмейстер из Витебска Андрей Ковалев и бывший витеблянин Илья Смирин (Израиль).

Отличного результата в первенстве добилась минская команда "Веснянка", занявшая почетное шестое место. В активе "Веснянки" 10 командных очков.

Лидером команды был гроссмейстер Алексей Федоров (Могилев), набравший 5 очков из 7 возможных. Турнир он провел без единого поражения.

Результаты остальных участников: 2.Сергей Азаров — 4,5, 3.Андрей Жигалко — 4,5, 4.Сергей Жигалко — 4,5, 5.Игорь Люцко — 5, 6.Евгений Мочалов — 4,5. Как видим, все участники команды выступили очень достойно. В результате достигнут лучший итог за все годы выступлений белорусской команды в европейском форуме.

Из творчества чемпионов

Как известно, матч за звание чемпиона мира между Веселином Топаловым (Болгария) и Владимиром Крамником (Россия) завершился победой российского шахматиста. Решающие события состоялись на тай-брейке, который последовал после того, как основная часть матча завершилась вничью со счетом 6:6. В дополнительных партиях, проводившихся в быстрые шахматы, удача сопутствовала Крамнику, победившему со счетом 2,5:1,5. Общий счет поединка: 8,5:7,5. Таким образом завершился трудный процесс объединения, шахматный мир получил наконец единого чемпиона мира.

Приводим одну из партий чемпиона мира, сыгранную в матче.

Десятая партия
В.Крамник—В.Топалов
Каталонское начало

1.d4 Kf6 2.c4 e6 3.Kf3 d5 4.g3 Cb4+ 5.Cd2 Ce7 6.Cg2 o-o 7.o-o c6 8.Cf4 Kbd7 9.Фc2 a5 10.Jd1 Kh5 11.Cc1 b5 12.cb cb 13.e4. Уступая сопернику в счете, Крамник стремился осложнить борьбу. 13...de 14.Ф:e4 Jb8 15.Фe2 Khf6 16.Cf4 Jb6 17.Ke5 Kd5 18.C:d5 ed 19.Kc3 Kf6 20.K:b5 Ca6 21.a4 Ke4 22.Jdc1 Фe8 23.Jc7 Cd8 24.Ja7 f6? Решающая ошибка. Между тем после напрашивающегося 24...C:b5 25.ab Ф:b5 26.Ф:b5 J:b5 27.Kd7 Je8 черные сохраняли хорошие шансы на ничью. 25.Kd7. Конечно. Теперь сопернику не избежать материальных потерь. 25...Jf7 26.K:b6 J:a7 27.K:d5 Jd7 28.Kdc3 J:d4? 29.Je1. Проще всего сразу 29.f3 с выигрышем фигуры. 29...f5 30.Фc2 Jb4 31.Kd5 J:b5. Приходится отдавать качество. 32.ab Ф:b5 33.Kc7 Фc4 34.Фd1 C:c7 35.Фd7. Грозит мат в один ход: 36.Фe8x. 35...h6 36.Ф:c7 Фb4 37.Фb8+. Размен ферзей окончательно проясняет ситуацию. 37...Ф:b8 38.C:b8 Kd2 39.Ja1 g5 40.f4 Kb3 41.Ja3 Cc4 42.Cc7 g4 43.C:a5. **Черные сдались.**

«І вечнае з табою застанецца»,

або Паэтычная сустрэча з Генадзем Бураўкіным усё-ткі адбылася!

30 лістапада, на якое была прызначана творчая вечарына знанага паэта, раптам разнеслася вестка: "Кіна не будзе!" Адміністрацыю Рэспубліканскага Палаца мастацтва, дзе была замоўлена сустрэча, папярэдзілі: маўляў, па тэхнічных прычынах якраз у гэты дзень у будынку будзе адключана электрычнасць...

Ведаем мы гэтыя "тэхнічныя прычыны" (няспраўную электраправодку, пажарную небяспеку, а то і праверку "на міну") — яны ўзнікаюць чамусьці якраз, калі мае сабрацца дэмакратычная грамадскасць.

Усё ж, нягледзячы на "адключнае" паведамленне, накіроўваюся да Палаца. Бадай, не дзіўна было б у такой сітуацыі ўбачыць ля параднага міліцэйскі кардон і натоўп мітынгоўцаў з самаробнымі плакатамі кшталту "Паэзію не задушыш!", "Бураўкіну — званне народнага!" і г.д. Але, на шчасце, будынак аказаўся асветленым, па прыступках да ўваходу падымаліся людзі з кветкамі. А ўмяшчальная канферэнц-зала, амаль за гадзіну да прызначанага пачатку, ужо трашчала па швах, шмат хто стаяў уздоўж сцен. Калі ж зазірнуў, яшчэ ў паліто, сам віноўнік урачыстасці, усе паўскоквалі з месц, наладзілі авацыю, размахваючы букетамі, — ну, быццам машына часу перанесла нас у мінулыя гады, на сустрэчу Першага касманаўта Зямлі...

Вечарына ўдалася на славу, хоць і не ўсе творцы, якія абяцалі ўзяць у ёй удзел (напрыклад, слынныя кампазітары Ігар Лучанок і Эдуард Зарыцкі, вядомыя спевакі Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч), упрыгожылі свята сваёй прысутнасцю: магчыма, падзейнічала "далікатнае" папярэджанне наконт таго, чаго ім не варта рабіць. Але ўсё роўна атрымалася пасямейнаму цёплая, сардэчная, без парушынкі казёншчыны сустрэча любімага ў народзе паэта з удзячнымі прыхільнікамі яго шчодрага таленту.

Вяла вечарыну чароўная і бясконца абаяльная народная артыстка Беларусі, былая "зорная" тэлевядучая **Зінаіда Бандарэнка**. Адкрывала ж яе другая наша нязгасная "зорка" — зорка нацыянальнага тэатральнага мастацтва, народная артыстка-купалаўка **Марыя Захарэвіч**. Яна прызналася, што ўвесь час вяртаецца да кніг паэта з іх вытанчанасцю пачуццяў, глыбокім лірызмам, уменнем чытаць "тайнапіс вачэй". Дарэчы, як і Генадзь Мікалаевіч, Марыя Георгіеўна нядаўна адзначыла сваё 70-годдзе. Але як жа молада, акрылена, натхнёна гучалі з яе вуснаў вершы паэта аб каханні і любові да Бацькаўшчыны, якія і сталіся лейтматывам усёй вечарыны.

Адзін за адным падымаліся на сцэну, каб абняць юбіляра, павітаць шчырым словам яго сапраўдныя сябры, знаёмыя і незнаёмыя. Зразумела, не мог не прыйсці колішні аднакурснік Генадзя па універсітэце, з якім яны разам ступілі на літаратурную сцяжыну, народны паэт Беларусі **Рыгор Барадулін**.

— Дзе б ні быў, ні працаваў Генадзь — на "пасадзе" паэта ці рэдактара літаратурнага часопіса, кіраўніка ў свой час Беларускага радыё і тэлебачання, прадстаўніка нашай краіны ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, ён заўсёды працаваў на Беларусь і беларускасць. І ўвасабляў яе, — сказаў Рыгор Іванавіч. — *Гэта — знакавая постаць у нашым мастацкім і грамадскім жыцці.*

Сабрацці па пяры **Анатоль Вярцінскі** і **Алесь Пашкевіч**, акадэмік **Радзім Гарэцкі**, ксёндз-пробашч касцёла Св.Сымона і Св.Алены **Уладзіслаў Завальнюк**, рэжысёр **Валер Мазынскі,** цэлая кагорта знаных мастакоў — **Леанід Шчамялёў**, **Гаўрыла Вашчанка**, **Уладзімір Басалыга**, **Васіль Шаранговіч**, **Сяргей Давідовіч**, **Рыгор Сітніца**, **Уладзімір Вішнеўскі** і іншыя (якое суквецце яркіх імён!) — прынеслі ў дар паэту і грамадзяніну плён уласнага натхнення. Яму дарылі кнігі, карціны, вершаваныя прысвячэнні, спевы і музыку. У "кошыку" з дарункамі прыдаліся дарэчы і слоік з крамянымі баравічкамі, і пляшка вясковага "бульбяша"...

Шчаслівы паэт расчулена дзячыў дарагім людзям за шчырасць і дабрыню. Нягледзячы на тое, што ён нядаўна пабываў у бальніцы, выглядаў цудоўна і цудоўна трымаўся, сыпаў дасціпамі ў жартлівай пікіроўцы з выступоўцамі, цвіў, бы малады. А потым выйшаў са сваімі новымі вершамі, якія складуць кнігу **"Лісты да запатрабавання"**. І мы зноў пачулі голас ягонай Музы — то пяшчотна-лірычнай, то іранічна-ўсмешлівай, то па-філасофску роздумнай, то па-грамадзянску набатнай. Вершы прасякнуты ўпэўненасцю:

І вечнае з табою застанецца,
А ўсё пустое з памяці сплыве.

У гэтых радках — вера ў перамогу дабра над злом, любові над нянавісцю, людскога братэрства над хіжасцю. Міжволі думалася, што такой, хай сабе і маленькай перамогай, стаўся і гэты незабыўны вечар. У рэшце рэшт, у забараняльшчыкаў жывога, вольнага паэтычнага слова хапіла на гэты раз розуму "адкруціць назад", каб не дэманстраваць публічна сваю унтэр-прышыбееўшчыну. Ды і, адмяніўшы вечарыну, хіба можна адмяніць Паэзію?

Сваю ролю тут хутчэй за ўсё адыграла салідарнае памкненне славутых дзеячаў нацыянальнай культуры не дапусціць разгул глупства, якое ўсім да немагчымасці надакучыла.

...Вельмі мне хацелася задаць Генадзю Мікалаевічу адно пытанне: а ці паўтарыў бы ён сёння свае даўнія, ужо хрэстаматыйныя радкі:

Я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў
Ён выбраў для мяне старонку гэту...

Але як было прабіцца праз цесны круг людзей, што ўзялі ў палон і не адпускалі паэта?

І ўсё ж бяру на сябе смеласць спрагназаваць яго магчымы адказ: "Канешне, паўтару, і не адзін раз!"

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.
Фота photo.bymedia.net

БОЛЬШОЙ ТЕННІС

Ни шагу назад

Прошлогодние победители Кубка Дэвиса — хорваты, опустились на третью строчку. Сборная Беларуси осталась на 9-м месте.

Рейтинг Кубка Дэвиса:

1. (2) Россия — 27192,50;
2. (3) Аргентина — 21333,75;
3. (1) Хорватия — 20545,63;
4. (4) Испания — 15237,50;
5. (5) Австралия — 13750,00;
6. (6) США — 13250,00;
7. (7) Словакия — 10251,25;
8. (8) Франция — 8125,00;
9. (9) Беларусь — 6698,13;
10.(10) Швейцария — 4929,69.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 6.12.2006 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №